# ГЕНПРАКУРАТУРА БЕЛАРУСІ ПРАПАНУЕ ЗМЯНІЦЬ ПАРАДАК ДЭКЛАРАВАННЯ МАЁМАСЦІ ДЗЯРЖАЎНЫХ СЛУЖБОВЫХ АСОБАЎ

**Генпракуратура Беларусі прапануе пашырыць пералік дэкларуемай маёмасці і прыватных інтарэсаў дзяржаўных службовых асобаў. Аб гэтым карэспандэнту БЕЛТА паведамілі ў галоўным пракурорскім ведамстве краіны.**

У Генеральнай пракуратуры прааналізавалі дзеючае нацыянальнае заканадаўства аб дэклараванні даходаў і маёмасці дзяржаўнымі служачымі і іншымі асобамі, упаўнаважанымі на выкананне дзяржаўных функцый (дзяржаўныя службовыя асобы), з улікам вопыту работы ў гэтай сферы іншых дзяржаў і патрабаванняў міжнародна-прававых актаў, ратыфікаваных у Беларусі. «Генеральная пракуратура лічыць, што ў Беларусі мэтазгодна ўвесці адносна дзяржаўных службовых асобаў інстытут дэкларавання даходаў, маёмасці і прыватных інтарэсаў, які павінен адыграць істотную ролю ў процідзеянні карупцыі», — заявілі ў пракурорскім ведамстве.

Пад прыватнымі інтарэсамі дзяржаўнай службовай асобы разумеецца любая выгада для яе асабіста або яе сям'і, сваякоў, сяброў і блізкіх, а таксама для асобаў або арганізацый, з якімі яна мае ці мела дзелавыя або звязаныя з палітыкай адносіны, любое фінансавае або грамадзянскае абавязацельства, якое нясе дзяржаўная службовая асоба. Аб'ём дэкларуемых дзяржаўнымі службовымі асобамі звестак павінен істотна адрозніваецца ад аб'ёму звестак, што называюцца іншымі фізічнымі асобамі ў дэкларацыях аб даходах і маёмасці. Пры гэтым дзяржаўную службовую асобу трэба абавязаць дэкларавваць грашовыя сродкі на банкаўскіх рахунках, пазыкі, выдадзеныя іншым асобам, бязвыплатна атрыманыя паслугі і інш.

Асноўнай мэтай дэкларавання даходаў, маёмасці і прыватных інтарэсаў павінна стаць выяўленне наяўнасці ў дзяржаўных службовых асобаў канфлікту інтарэсаў, г.зн. сітуацыі, калі дзяржаўная службовая асоба пры выкананні службовых абавязкаў павінна прыняць рашэнне, звязанае з яе прыватнымі інтарэсамі, або ўдзельнічаць у прыняцці такога рашэння. Пры наяўнасці канфлікту інтарэсаў неабходна ўстанавіць для дзяржаўных службовых асобаў пэўныя забароны і абмежаванні па службе (забарону на падрыхтоўку або выданне адміністрацыйных актаў адносна асобаў, з якімі ёсць канфлікт інтарэсаў; ажыццяўленне адносна гэтых асобаў судовых функцый, функцый нагляду, кантролю, следства і дазнання; заключэнне з гэтымі асобамі ў сувязі з выкананнем абавязкаў дзяржаўнай службовай асобы гаспадарчых дагавораў і г.д.).

З улікам вопыту іншых дзяржаў Генеральная пракуратура лічыць магчымым разгледзець пытанне аб увядзенні ў Беларусі для асобных катэгорый дзяржаўных служачых абавязку прадстаўляць дэкларацыі пасля заканчэння выканання службовых абавязкаў. Прапануецца таксама ўвесці ў Беларусі абавязковае прадстаўленне дзяржаўнымі службовымі асобамі дэкларацый адносна мужа (жонкі) і няпоўнагадовых дзяцей незалежна ад месца іх пражывання і вядзення агульнай гаспадаркі.

Акрамя таго, Генеральная пракуратура лічыць, што дэкларацыі адносна названых асобаў павінны прадстаўляцца тымі, хто паступае на дзяржаўную службу, а таксама на ваенную службу па кантракце, службу ў органы і падраздзяленні па надзвычайных сітуацыях, органы ўнутраных спраў і органы фінансавых расследаванняў Камітэта дзяржкантролю. Такія дэкларацыі Генпракуратура Беларусі таксама прапануе зрабіць абавязковымі для асобаў, якія назначаюцца на пасады кіраўнікоў дзяржаўных арганізацый і пасады кіраўнікоў недзяржаўных сельскагаспадарчых арганізацый (калі з імі, у адпаведнасці з заканадаўствам, мясцовымі выканаўчымі і распарадчымі органамі абавязкова заключаюцца кантракты).

Гэтыя меры, упэўнены ў Генпракуратуры, дадуць магчымасць даць аб'ектыўную ацэнку змяненням маёмаснага становішча дзяржаўнай службовай асобы, яе мужа (жонкі), дзяцей і іншых залежных асобаў з моманту назначэння на адпаведную пасаду.

Таксама Генпракуратура лічыць мэтазгодным замацаваць у Палажэнні аб парадку праверкі і захоўвання дэкларацый аб даходах і маёмасці, зацверджаным пастановай Савета Міністраў ад 26 ліпеня 2006 года № 952, наступныя падставы, па якіх кіраўнік (намеснік кіраўніка) арганізацыі абавязаны прыняць рашэнне аб праверцы дэкларацыі аб даходах і маёмасці.

У прыватнасці, на думку пракуратуры, гэта неабходна зрабіць пры яўным перавышэнні расходаў дзяржаўнай службовай асобы (паляпшэнне маёмаснага становішча) над атрыманымі ёй даходамі; наяўнасці ў зваротах фізічных і юрыдычных асобаў, СМІ звестак, якія сведчаць аб тым, што дзяржаўная службовая асоба выкарыстоўвала маёмасць, у тым ліку фінансавыя сродкі, кошт (памер) якой перавышае названыя ёй у дэкларацыі даходы; парушэнні дзяржаўнай службовай асобай абмежаванняў, устаноўленых арт.17 Закона «Аб барацьбе з карупцыяй».

Калі ў ходзе праверкі дэкларацый аб даходах і маёмасці будуць выяўлены парушэнні, разгляд якіх не знаходзіцца ў кампетэнцыі кіраўніка арганізацыі, які назначыў праверку, адпаведныя матэрыялы праверак не пазней за 10-дзённы тэрмін пасля інфармавання кіраўніка арганізацыі перадаюцца ва ўпаўнаважаныя органы. Адначасова ў заканадаўстве неабходна ўстанавіць права арганізацый, абавязаных праводзіць праверкі дэкларацый аб даходах і маёмасці, на бясплатнае атрыманне інфармацыі аб даходах і маёмасці правяраемых асобаў з органаў і арганізацый, якія ў адпаведнасці з заканадаўствам могуць мець такую інфармацыю, у тым ліку з органаў дзяржаўнай рэгістрацыі нерухомай маёмасці.

На думку Генеральнай пракуратуры, у Рэспубліцы Беларусь мэтазгодна абмежаваць прынцып недапушчальнасці выдавання звестак, названых у дэкларацыях аб даходах і маёмасці, і ўвесці абавязковае адкрытае апублікаванне звестак з дэкларацый асобных катэгорый дзяржаўных служачых, якія займаюць найбольш высокапастаўленыя пасады. Пры гэтым можна вызначыць тыя звесткі, якія абнародаванню не падлягаюць.

Пісьмо з гэтымі прапановамі накіравана Генеральнай пракуратурай у Савет Міністраў Беларусі.

Заробкі і выдаткі

# БЕЛАРУСЫ СТАЛІ БОЛЬШ... АШЧАДНЫМІ

Сяргей ГРЫБ

**НЯГЛЕДЗЯЧЫ на праблемы ў эканоміцы, летась беларусы ў цэлым здолелі захаваць узровень жыцця «дакрызіснага» 2008 года. Але пры гэтым даводзіцца канстатаваць, што мы сталі больш думаць пра заўтрашні дзень. У прыватнасці, статыстыка сведчыць: на працягу мінулага года ў краіне ўзраслі банкаўскія ўклады.**

### На заробках мы — чацвёртыя

Паводле звестак Нацыянальнага статыстычнага камітэта, летась намінальныя даходы ў разліку на аднаго «сярэдняга» грамадзяніна Беларусі склалі 775 тысяч, тады як пазалетась — 648 тысяч рублёў у месяц. Але пры гэтым рост рэальных, з улікам змянення цэнаў, даходаў, аказаўся больш сціплым і склаў усяго 2,9 працэнта. Як выявілася, адзначыла намеснік старшыні камітэта Алена Кухарчык, суадносіны сярэдніх даходаў з мінімальным спажывецкім бюджэтам і бюджэтам пражытковага мінімуму засталіся практычна на ўзроўні 2008 года.

Што да прычын, то яны відавочныя — замаруджванне росту такіх асноўных крыніц існавання беларусаў, як зарплата і пенсія. Па выніках мінулага года рэальныя заробкі беларусаў зменшыліся на 0,4 працэнта. Так, зніжэнне рэальных заробкаў па навуцы і навуковым абслугоўванні склала 0,3, па культуры і мастацтве — 1,9, адукацыі — 2,4, ахове здароўя — 3,1, прамысловасці — 4,2, лясной гаспадарцы — 13,6 працэнта. Менш адчулі крызісныя з'явы работнікі сельскай гаспадаркі (тут наадварот адзначаны рост на 6,2 працэнта), сувязі (на 3,5 працэнта), гандлю і грамадскага харчавання (3 працэнты), будаўніцтва (2,7 працэнта), апроч таго, на 5 працэнтаў павысіліся рэальныя заробкі па малых і мікраарганізацыях.

У цэлым жа па ўзроўні аплаты працы ў СНД Беларусь апынулася на чацвёртым месцы. Так, сярэдняя зарплата ў нас адпавядала 356 доларам. Для параўнання: той жа паказчык у Расіі быў 628, Казахстане — 455, Азербайджане — 371, ва Украіне — 239.

Асобная тэма — пенсіі. Тут малюнак атрымаўся вельмі падобным. У канцы мінулага года іх сярэдні памер у Беларусі адпавядаў 430 тыс. рублёў — у рэальным вымярэнні гэта аказалася на 0,2 працэнта больш, чым пазалетась. Пры гэтым, заўважыла Алена Кухарчык, сярэдняя пенсія па ўзросце ў снежні склала 450 тыс., сярэдняя пенсія па інваліднасці — 395 тыс., па выпадку страты карміцеля — 267 тыс., а сацыяльная пенсія — 187 тыс. рублёў. Дарэчы, доларавая раскладка па сярэдніх пенсіях атрымалася наступнай: Расія — 204, Беларусь — 150, Украіна — 129.

### Розніца змяншаецца

Не менш цікавым падаюцца вынікі выбарачнага абследавання хатніх гаспадарак — сем'яў і адзінокіх грамадзян. Летась даходы сярэдняй хатняй гаспадаркі нашай краіны склалі 1,6 млн рублёў у месяц, у тым ліку 1,7 мільёна ў гарадах і гарадскіх пасёлках і 1,3 мільёна — у вёсках.

Як паведаміла Алена Кухарчык, у параўнанні з 2008 годам рэальныя даходы хатніх гаспадарак у цэлым па Беларусі павялічыліся на 0,9 працэнта. Але пры гэтым калі па сельскай мясцовасці быў адзначаны рост на 1,3, то па гарадах — ужо зніжэнне на 1,6 працэнта. Гэта прывяло да змяншэння разрыву ва ўзроўні дабрабыту: у 2008 годзе даходы гарадскіх хатніх гаспадарак перавышалі даходы хатніх гаспадарак у вёсках на 37, а летась — толькі на 33 працэнты.

Гэтаксама скараціўся разрыў даходаў і па асобных групах насельніцтва. Даходы ў найбольш беднай часткі беларусаў павялічваліся хутчэй, чым у часткі больш багатай. Розніца ў даходах 10 працэнтаў найбольш і найменш заможных грамадзян краіны летась склала 5,6, тады як пазалетась — 5,9 раза.

Да слова, больш хуткі рост даходаў найменш багатых грамадзян краіны даў яшчэ адзін вынік. У параўнанні з пазамінулым годам доля беларусаў, якія знаходзяцца за рысай бюджэту пражытковага мінімуму, скарацілася з 6,1 да 5,4 працэнта, або з 577 да 508 тысяч чалавек. Узровень малазабяспечанасці сярод хатніх гаспадарак, якія складаюцца з 1 чалавека, зменшыўся з 0,9 да 0,8, сярод хатніх гаспадарак без дзяцей — з 2,2 да 2, а хатніх гаспадарак з дзецьмі ва ўзросце да 18 гадоў — з 8,6 да 7,5 працэнта. Праўда, адначасова нельга не заўважыць: у катэгорыю малазабяспечаных па-ранейшаму трапляе кожная трэцяя шматдзетная сям'я.

### Не выпадае эканоміць толькі на паслугах

Ці не галоўная праява крызісу ва ўсім свеце — зніжэнне спажывецкага попыту. Паводле слоў Алены Кухарчык, летась доля расходаў грамадзян Беларусі на набыццё прадуктаў харчавання склала 40,2 працэнта — пазалетась гэты паказчык быў на 1 пункт большым. У параўнанні з 2008 годам таксама скарацілася ўдзельная вага такіх артыкулаў, як набыццё алкаголю (з 2,3 да 2,2 працэнта) і набыццё нехарчовых тавараў (з 35,2 да 34,8 працэнта). Але, з іншага боку, з 21,3 да 22,8 працэнта павялічылася доля выдаткаў на паслугі — перш-наперш на жыллёва-камунальныя і бытавыя.

Як засведчыў маніторынг Нацыянальнага статкамітэта, летась у сярэднім адна хатняя гаспадарка выдаткоўвала на харчаванне 460 тыс. рублёў у месяц. У параўнанні з 2008 годам з улікам індэкса росту цэнаў гэты паказчык скараціўся на 5 працэнтаў. Прычым «сярэднестатыстычны» беларус зменшыў спажыванне хлеба на 10 працэнтаў (да 82 кілаграмаў у год), мяса і мясапрадуктаў — на 3 працэнты (64 кілаграмы), рыбы і рыбапрадуктаў — на 7 працэнтаў (14 кілаграмаў), бульбы — на 10 працэнтаў (64 кілаграмы). А вось спажыванне малочных прадуктаў і агароднiны засталося практычна нязменным.

Паказальная сітуацыя — і набыццё нехарчовых тавараў. Летась на іх сярэдняя хатняя гаспадарка выдаткоўвала 400 тыс. рублёў у месяц. З улікам індэкса цэнаў у параўнанні з пазамінулым годам тут таксама адзначана скарачэнне — на 0,6 працэнта. Алена Кухарчык заўважыла: беларусы радзей куплялі дарагія культурна-бытавыя тавары і мэблю. Аднак у той жа час працягвала расці забяспечанасць хатніх гаспадарак таварамі працяглага карыстання. За мінулы год у разліку на 100 хатніх гаспадарак колькасць каляровых тэлевізараў павялічылася са 140 да 145, відэа- і DVD-магнітафонаў — з 56 да 63, халадзільнікаў з маразільнікамі — са 124 да 127, аўтаматычных пральных машын — з 50 да 58, печак ЗВЧ — з 39 да 47, персанальных камп'ютараў — з 32 да 40. І, дарэчы, летась кожная чацвёртая хатняя гаспадарка мела «прыватны» доступ у інтэрнэт. У параўнанні з 2008 годам апошняя лічба павялічылася ў 1,2, а ў сельскай мясцовасці — нават у 1,4 раза. Па сутнасці Сецівам ужо карыстаецца кожная дзясятая вясковая сям'я.

Нарэшце, трэцяя значная пазіцыя — паслугі. Гэты артыкул «пацягнуў» з бюджэту сярэдняй хатняй гаспадаркі 260 тыс. рублёў у месяц, прычым зноў жа з улікам індэкса цэнаў, адносна 2008 года ён павялічыўся на 4 працэнты. Між тым, заўважыла Алена Кухарчык, менавіта летась адбылося змяненне непасрэдна эканамічных паводзінаў насельніцтва. Частка беларусаў пачала абмяжоўваць «бягучае спажыванне» з мэтай назапашвання грошай. У нечым гэта тлумачыцца неабходнасцю пагашэння ранейшых крэдытаў і даўгоў. Але не толькі — адначасова летась хатнія гаспадаркі краіны накіравалі ва ўклады і ашчаджэнні на 18 працэнтаў сродкаў больш, чым пазалетась.

# «Чаму ў краіне не збіраюць ад насельніцтва складанабытавую тэхніку, якая адслужыла свой век?»

*(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)*

Адразу варта адзначыць, што ўсе суразмоўцы, з кім даводзілася разбірацца па пытанні-прапанове чытача, называлі яе па агульным сэнсе вельмі слушнай, адпаведнай пазіцыі цывілізаванай краіны. Але... Гэтыя ж спецыялісты, не згаворваючыся, перш-наперш адзначалі, што праблема ўтылізацыі складанабытавой тэхнікі не адрэгулявана на заканадаўчым узроўні. Калі вельмі проста: чалавек набыў рэч, ён — яе ўласнік. Вытворца не мае права прыехаць і забраць той жа стары тэлевізар. Гаспадар сам павінен паклапаціцца пра яго ўтылізацыю. Але, паколькі і гэты нюанс нідзе дакладна не прапісаны, «утылізуе» грамадзянін складанабытавую тэхніку проста і звыкла — цішком выставіўшы на вуліцу да пад'езда.

### Праблема не ў зніжках, а ва ўтылізацыі

— Ідэя даваць кліенту зніжку за здадзеную старую бытавую тэхніку ўзнікала неаднойчы, але ж самі вытворцы неўзабаве ад яе і адмаўляліся. Даць зніжку — не праблема. Праблема ў самой утылізацыі, — распавёў работнік гарантыйнай майстэрні ад завода «Гарызонт». — Для аднаго тэлевізара яна каштуе 70 тысяч рублёў. Значыць, улічваючы магчымыя аб'ёмы, гэтая справа адразу робіцца стратнай для любога прадпрыемства. Напрыклад, колькі гадоў таму, калі асноўную масу складалі кінескопныя тэлевізары, аб'ёмы продажу толькі нашага прадпрыемства складалі каля паўмільёна тэлепрыёмнікаў за год. Цяпер гэты паказчык, думаю, складае каля 150—200 тысяч тэлевізараў. А імпарт? Да таго ж у многіх сем'ях цяпер не адзін, а два-тры тэлевізары. А ўключыць кошт утылізацыі ў цану тэлевізара — значыць адпужнуць пакупніка.

— Колькі гадоў таму наша прадпрыемства праводзіла ў рэкламных мэтах разавую акцыю, калі пры здачы працуючага халадзільніка аднаго з першых выпускаў грамадзяніну давалася зніжка на куплю новай мадэлі. На той момант такіх халадзільнікаў, якія адпрацавалі па 30 гадоў і больш, аказалася занадта шмат. Але гэта ненармальна. Халадзільнік, які працуе 35 гадоў — гэта ад галечы. Бо тэрмін службы гэтага халадзільнага агрэгата — 10 гадоў. Пасля гэтага тэрміну ён папросту становіцца небяспечным, бо могуць узнікнуць праблемы, напрыклад, з ізаляцыяй праводкі. Вытворца не нясе адказнасці за яго далейшую эксплуатацыю, — дапоўніў папярэдні аповед прадстаўнік адміністрацыі ЗАТ «Атлант».

— Больш таго, калі тры гады таму тэрмін службы тэлевізара складаў 10 гадоў, дык зараз ён зніжаны да 7 гадоў. І гэта яшчэ не факт, што праз азначаны тэрмін атрымаецца знайсці для яго, напрыклад, новы кінескоп, паколькі ўвесь час з'яўляюцца новыя тэхналогіі. Запчасткі можна браць з запасаў, што ляжалі на складах, але толькі не карыстаныя, — працягнуў гэтую завочную гутарку прадстаўнік гарантыйнай майстэрні. — Нават калі ўявіць сабе, што можна было б выкарыстоўваць запчасткі са старых тэлепрыёмнікаў, гэта ж таксама выдаткі па іх дастаўленні. А ўтылізацыя складанабытавой тэхнікі для любога прадпрыемства, арганізацыі абавязкова мае на ўвазе яшчэ і папярэднюю здачу каштоўных металаў, што знаходзяцца ў апаратуры. Звычайнага ж грамадзяніна такое пытанне не турбуе.

### Патрэбны яшчэ і адпаведныя тэхналогіі

ААТ «Белдругасрэсурсы» прымае ад насельніцтва другасную сыравіну ад прадметаў бытавога і небытавога прызначэння з чорных і каляровых металаў. І грамадзянін можа самастойна здаць, напрыклад, стары халадзільнік. Праўда, папярэдне ён павінен дастаць з яго шкляныя паліцы, калі яны былі, зняць пластмасавыя дэталі. Аднак нейкага цэнтралізаванага збору былой у карыстанні складанабытавой тэхнікі, як паведамілі нам у вытворчым аддзеле прадпрыемства, тут няма. Ды і як можна было б перапрацаваць той жа тэлевізар, калі адсутнічаюць тэхналогіі кшталту японскіх.

Пра іх, дарэчы, згадвалі амаль усе суразмоўцы. Не ведаем, ці бачыў наш чытач той тэлесюжэт, але спецыялісты чамусьці сышліся на меркаванні, што менавіта ён стаў адпраўным пунктам у прапанове Васіля Канстанцінавіча.

— У Японіі перапрацоўка бытавой тэхнікі — бізнэс. А мы некаторыя другасныя рэсурсы закопваем на палігонах, — эмацыйна заўважыў адзін з суразмоўцаў. — Трэба сказаць і пра культуру людзей. У Японіі, Германіі нельга проста так выкінуць непатрэбную бытавую тэхніку на сметніцу. Суседзі абавязкова заўважаць і паведамяць куды трэба. І табе той тэлевізар назад дадому прынясуць...

### Лом металаў на палігоны не вывозяць

— Нейкае падабенства сістэмы, пра якую марыць ваш чытач, існуе і зараз, хоць назваць яе цалкам цывілізаванай, напэўна, нельга, — адгукнуўся на наш чарговы запыт прадстаўнік КУП па абыходжанні з адходамі «Экарас». — На палігон не можа паступіць тая ж пральная машына, халадзільнік, газавая ці электрычная пліта і гэтак далей, бо гэта лом чорных і каляровых металаў, за яго вываз могуць вінаватых і пакараць. Таму ЖРЭА праз свае ЖЭСы дастаткова рэгулярна збіраюць такі буйнагабарытны груз, які насельніцтва выстаўляе да пад'ездаў, і сарціруюць яго. Гэтая мера фактычна вымушаная, бо ў дварах павінна быць чыста, так? А, здаючы лом чорных і каляровых металаў, ЖЭСы ў пэўнай ступені пакрываюць свае выдаткі па вывазу і сарціроўцы другаснай сыравіны. Наша прадпрыемства хацела б весці нарыхтоўку каляровых металаў праз прыёмныя пункты, але ў нас няма адпаведнай ліцэнзіі. Мы маем права збору толькі на палігонах.

### Здаў аўто — атрымаў зніжку

Напрыканцы можна яшчэ прыгадаць пра эксперымент па ўтылізацыі старых аўтамабіляў, што нядаўна распачаўся ў Расіі. Сутнасць яго ў тым, што цяпер расійскія аўтааматары могуць здаць сваю машыну і атрымаць за гэта 50 тысяч расійскіх рублёў. Грошы дадуць у якасці зніжкі пры куплі новага аўтамабіля. На ўтылізацыю можна будзе здаць любое аўто (хоць айчыннае, хоць імпартнае), галоўнае, каб яно было выпушчана не пазней за 1999 год і вагай было не больш за 3,5 тоны. Каб не было спекуляцый, прынята рашэнне, што валодаць такой машынай трэба больш за год. Прымацца будуць цалкам камплектныя аўтамабілі: з рухавіком, акумулятарам, коламі. Купіць таксама можна будзе толькі аўто, якое будзе выраблена ў Расіі, уключаючы іншамаркі расійскай зборкі. Урадам Расіі зацверджаны пералік з 66 мадэляў машын, спіс аўтадылераў, якія будуць удзельнічаць у дзяржпраграме па ўтылізацыі старых аўтамабіляў. Дарэчы, урад да канца дзеяння эксперымента — да 1 лістапада гэтага года — плануе прадаць са зніжкай да 200 тысяч новых машын...

**Сяргей РАСОЛЬКА.**

# ЗАМЕСТ ХЛЕБА І БУЛЬБЫ САЛДАТАМ ДАДУЦЬ СМЯТАНУ, СЫР І ВІТАМІНКІ

**Наборы прадуктаў па агульнавайсковым, інжынерна-тэхнічным і курсанцкім пайках змяняюцца з 1 красавіка ва Узброеных Сілах Беларусі, паведаміў на прэс-канферэнцыі намеснік міністра абароны па тыле, начальнік тылу Узброеных Сілаў генерал-маёр Аляксандр БАЛІГАТАЎ:**

— Напрыклад, у наборы прадуктаў па агульнавайсковым пайку наступныя змены: паменшана колькасць прадуктаў хлебнай групы на 220 г, розных круп — на 25 г, цукру — на 10 г, бульбы — на 150 г; павялічана колькасць сокаў на 50 г, гарбаты — на 0,8 г, гарчычнага парашку — на 0,3 г. Акрамя таго, штодзённа, а не тры разы на тыдзень, будзе выдавацца яйка, дадаткова ўведзены ў норму 20 г смятаны, 15 г цвёрдага сычужнага сыру, 1 дражэ полівітаміннага прэпарата, а замест 40 г каўбасных вырабаў уведзена 40 г мяса птушкі, — раскрыў сакрэт пайка беларускага салдата з 1 красавіка генерал-маёр Аляксандр Балігатаў.

Па яго словах, спецыялісты Рэспубліканскага навукова-практычнага цэнтра гігіены і Навукова-даследчага інстытута Узброеных Сілаў прыйшлі да высновы, што гэтыя змены дазволяць у поўным аб'ёме папаўняць энергазатраты вайскоўцаў.

У сваю чаргу **начальнік харчовага ўпраўлення Міністэрства абароны палкоўнік Рыгор ГОЛУБ** упэўнены, што салдаты не стануць менш атрымліваць ежы, затое іх харчаванне стане больш збалансаваным:

— Калі праводзіліся даследаванні, нам зрабілі заўвагу, што было больш бялкоў расліннага паходжання, а жывёльнага — не хапала. Таму было прынятае такое рашэнне і распрацаваныя новыя пайкі, — лічыць Рыгор Іванавіч.

Што датычыцца полівітаміннага прэпарата, то, па словах Рыгора Голуба, медыкі працуюць над распрацоўкай гэтага комплексу, магчыма нават, што ў розныя сезоны года будуць ужывацца розныя вітаміны.

У цэлым генерал-маёр Аляксандр Балігатаў адзначыў, што сёння тыл Узброеных Сілаў надзейна забяспечвае жыццядзейнасць войскаў.

У прыватнасці, у 2009 годзе вайскоўцы зэканомілі 13,6 мільярда рублёў ад укаранення энергазберагальных мерапрыемстваў, а таксама за кошт інвестыцыйнага праекта з ААТ «Трайпл»: да 2015 года будзе пабудавана 32 жылыя дамы на 3288 службовых кватэр. Прычым, адзначыў Аляксандр Балігатаў, праект з «Трайплам» узаемавыгадны — вайскоўцы атрымліваюць службовыя кватэры і ваенныя гарадкі, а для «Трайпла» вызваляюцца зямельныя плошчы для будаўніцтва камерцыйнага жылля ў Мінску і Мінскім раёне пры пераносе вайсковых часцей.

Бялізна і шкарпэткавыя вырабы, зробленыя з выкарыстаннем поліэфірных нітак з антыбактэрыяльнай дабаўкай, праходзяць доследную носку сёння ў некаторых вайсковых часцях.

— Прадметы рэчавай маёмасці пастаянна ўдасканальваюцца, а недахопы, выяўленыя падчас доследнай эксплуатацыі, даводзяцца да вытворцаў, і на забеспячэнне прымаюцца ўжо прадметы ваеннай формы адзення, якія поўнасцю адпавядаюць патрабаванням.

Прынамсі, Аляксандр Васільевіч расказаў, што цяпер выкарыстоўваецца для вырабу летніх касцюмаў тканіна «Альфа», якая па большасці параметраў пераўзыходзіць тканіну «Палёт», што прымянялася да гэтага. Па словах генерал-маёра, з мэтай аптымізацыі рэчавага забеспячэння практычна ўсе катэгорыі вайскоўцаў перайшлі на паўшарсцяное паўсядзённае абмундзіраванне аліўкавага колеру, а вайскоўцы тэрміновай службы атрымалі баваўняныя касцюмы з засцежкай-маланкай. Што датычыцца баявой формы адзення, то сёння яна вырабляецца з баваўнянай тканіны камбінаванага перапляцення з дабаўленнем высокатрывалых поліэфірных нітак з лічбавым метадам нанясення камуфляванага малюнка, што значна павышае ўласцівасці маскіроўкі.

Эксперыментуе Міністэрства абароны не толькі з адзеннем, але і з харчаваннем — прынамсі, працягваецца эксперымент па арганізацыі харчавання з частковым укараненнем прынцыпу «шведскага стала». Як адзначыў Аляксандр Балігатаў, такі спосаб харчавання дазваляе пашырыць асартымент страў да двух відаў халодных закусак, мясных і рыбных страў і гарніраў да іх. Такім чынам, вайскоўцы бачаць прыгатаваныя стравы і самастойна могуць выбраць найбольш смачнае і любімае на свой уласны густ.

**Павел БЕРАСНЕЎ.**

# БАНДА «ПРАЦАВАЛА» Ў ЭЛЕКТРЫЧКАХ

**Крымінальны «квартэт» падпойваў пасажыраў, якія ўжо былі нецвярозымі, а пасля рабаваў.**

Чацвёра бамжоў на працягу двух месяцаў абкрадвалі і рабавалі пасажыраў у электрычках брэсцкага, маладзечанскага і аршанскага напрамкаў. Арганізатарам жа злачыннага промыслу стаў 38-гадовы расійскі бомж, які прапанаваў дваццацігадоваму інваліду са Слуцка і двум 49-гадовым выхадцам з Бярэзінскага раёна паўдзельнічаць у злачыннай справе.

На справу зламыснікі выходзілі альбо позна вечарам, альбо ноччу. Прычым сваіх ахвяраў падазроныя шукалі толькі сярод тых, хто да гэтага "прыняў на грудзі". Апошнім яны і прапаноўвалі выпіць яшчэ, а калі падпоены чалавек засынаў, то "чысцілі" кішэні. У тых жа выпадках, калі ім трапляўся загартаваны кліент, які не паддаваўся дзеянню алкаголю, то яго рабавалі, прымяняючы сілу. Затрымалі злачынцаў сышчыкі Мінскага аддзела ўнутраных спраў на транспарце на адной са станцый мінскага рэгіёна, калі тыя дзялілі паміж сабой крадзенае. Зараз удзельнікі крымінальнага "квартэту" знаходзяцца ў следчым ізалятары, і на першапачатковым этапе следства яны прызналіся ў трох эпізодах злачыннай дзейнасці. Праваахоўнікі ўпэўненыя, што гэта далёка не ўвесь пералік учыненых імі крадзяжоў і рабаўніцтваў.

**Ігар ГРЫШЫН.**

# ВІЦЕБСКІМІ КАТЭДЖАМІ ПАЧАЛІ ЦІКАВІЦЦА БЫЛЫЯ ВАЕННЫЯ З МУРМАНСКА

*(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)*

Анатоль Вайтовіч адзначае, што нейкіх новых тэндэнцый на другасным рынку кватэр у Брэсце не назіраецца. Калі ў Мінску пасля істотнага патаннення маленькіх кватэр людзі з грашыма пачалі актыўна скупляць такое жыллё, то ў Брэсце проста назіралася стабілізацыя цэнаў, але ніхто актыўна слабенькае па якасці жыллё не набываў.

Менавіта разам з першым сур'ёзным цяплом кліенты пачалі актыўна цікавіцца пабудовамі ў садаводчых таварыствах. Агенцтва атрымлівае заяўкі на дачы коштам да 7 тысяч долараў. Аднак звычайных па якасці дач па такім кошце пад Брэстам няма. Сярэдняя цана стандартных дач у адлегласці да 10 кіламетраў ад Брэста складае 15—17 тысяч долараў. На рынку існуюць і двухпавярховыя дачы за 20 тысяч долараў, але попыт на такую нерухомасць сёння мінімальны.

### Дарагія катэджы «вісяць» у продажы каля года

Цяпер кліенты больш актыўна цікавяцца часткова недабудаванымі катэджамі па тыпу аднапакаёвых бунгала пад чыставую апрацоўку. На рынку такая нерухомая маёмасць разам з гаражом каштуе каля 80—82 тысяч долараў, але, хутчэй за ўсё, яна рэальна будзе прададзена не больш чым за 75 тысяч долараў. Цалкам гатовыя для жыцця бунгала з сучасным аздабленнем, дзе падлога з падагрэвам і агульная плошча памяшканняў складае каля 140 квадратных метраў, прапануюцца ў горадзе за 135 тысяч долараў. Існуюць у горадзе і шыкоўныя двухпавярховыя катэджы агульнай плошчай да 280 квадратных метраў. Такое жыллё разам з двума гаражамі прапануецца за 250 тысяч долараў. Жылыя дамы такога класа чакаюць дарагога замежнага пакупніка і працягваюць «вісець» на рынку даволі працяглы час.

Аднак сёння кліенты з Расіі вельмі дарагім жыллём у Брэсце амаль не цікавяцца. Так, у сакавіку расійскімі пакупнікамі была набыта звычайная двухпакаёвая кватэра за 42 тысячы долараў. Ужо сёлета сям'я з суседняй краіны купіла ў старым сектары горада не зусім новы, але моцны прыватны дом з агульнай плошчай жылля 78 квадратных метраў за 80 тысяч долараў. Дом пабудаваны на 10 сотках зямлі, мае чатыры пакоі і кухню. Яго набылі ўжо сталыя расіяне, якія збіраюцца жыць у Беларусі, бо тут у іх сваякі.

Магчыма гэтымі днямі ў Брэсце будзе прададзена самая дарагая сёлета кватэра. Стартавы кошт такога жылля пачынаўся са 170 тысяч, а рэальна яна будзе прададзена за 155 тысяч долараў. Гэта трохпакаёвая кватэра ў новым доме з эксклюзіўнай планіроўкай, убудаванай мэбляй, камінам і саўнай, агульная плошча жылля складае каля 130 квадратных метраў.

### «Хрушчоўкі» Віцебска яшчэ патаннелі на 2—3 тысячы USD

Пра гэта рэдакцыі паведаміў **дырэктар Рэспубліканскага ўнітарнага прадпрыемства «Дзяржаўнае агенцтва нерухомасці г. Віцебска» Уладзімір КАБАНАЎ.** Калі напрыканцы мінулага года аднапакаёвыя «хрушчоўкі» каштавалі каля 25 тысяч долараў, то сёння яны прадаюцца ўжо за 22—23 тысячы. Па такім кошце існуе жыллё з агульнай плошчай да 31—32 квадратных метраў. Стандартныя аднапакаёўкі агульнай плошчай да 38 «квадратаў» прапануюцца за 29—31 тысячу долараў. У новабудоўлях яны каштуюць ужо 33—34 тысячы долараў.

Двухпакаёвыя «хрушчоўкі» патаннелі з 35 тысяч да 33—32 тысяч долараў. Разам з тым, пры рэальных здзелках слабыя «двушкі» прадаюцца часам і за 31 тысячу долараў. Стандартныя двухпакаёўкі патаннелі за тры месяцы прыкладна на 3—4 тысячы долараў і цяпер каштуюць 38—40 тысяч. Трохпакаёвыя кватэры, як і раней, попытам не карыстаюцца; каштуюць каля 50 тысяч, а пры здзелках зніжкі могуць складаць 2—3 тысячы долараў.

**Усё часцей жыхары віцебскага рэгіёна заказваюць праз агенцтва старыя дамы пад знос. У аддаленых раёнах падобнае жыллё на ўчастках плошчай каля 6 сотак каштуе да 10 тысяч долараў. У ліквідных раёнах горада дамы пад знос на ўчастках 10—15 сотак прапануюцца ўжо да 15—25 тысяч долараў.**

Калі ў лютым цэны на другаснае жыллё ў Віцебску знізіліся, то ў сакавіку яны працягваюць заставацца на стабільна нізкім узроўні. Спецыялісты ўпэўненыя, што такая цэнасная тэндэнцыя захаваецца да лета, калі мясцовым жыллём зноў пачнуць цікавіцца багатыя расіяне, якія будуць адпачываць на «Славянскім базары». Непасрэдна мясцовыя жыхары набываюць кватэры на другасным рынку жылля ўсё менш, бо ў горадзе актыўна будуюцца шматкватэрныя дамы для асобаў з патрэбай у паляпшэнні жыллёвых умоў. Кошт квадратнага метра агульнай плошчы кватэр у панэльных дамах для чаргавікоў складае тут каля 1600—1800 тысяч рублёў.

### Актывізуецца попыт на дамы пад знос

За апошнія тры месяцы амаль не патаннела віцебская загарадная жыллёвая нерухомасць і катэджы ў гэтым абласным цэнтры. Якасныя сучасныя катэджы з агульнай плошчай да 150 квадратных метраў каштуюць сёння каля 120—150 тысяч долараў. А вось сапраўды грандыёзныя катэджы па 300 «квадратаў» на 7—8 пакояў пакупнікоў ужо практычна не знаходзяць.

Усё часцей жыхары віцебскага рэгіёна заказваюць праз агенцтва старыя дамы пад знос. У аддаленых раёнах падобнае жыллё на ўчастках плошчай каля 6 сотак каштуе да 10 тысяч долараў. У ліквідных раёнах горада дамы пад знос на ўчастках 10—15 сотак прапануюцца ўжо да 15—25 тысяч долараў. Пэўным попытам карыстаюцца невялікія прыватныя дамы ў Віцебску. Такое не зусім сучаснае жыллё з усімі выгодамі каштуе ў Віцебску да 50—60 тысяч долараў.

### Расіяне купляюць дамы побач з цудоўнай прыродай

Уладзімір Кабанаў упэўнены, што бліжэй да лета зацікаўленасць загараднымі дамамі Віцебшчыны з боку расіян павялічыцца ў разы. Жыхары суседняй дзяржавы заказваюць у агенцтвах нерухомасці невялікія, але моцныя драўляныя дамы побач з азёрамі і рэкамі недалёка ад Бярэзінскага біясфернага запаведніка. Такія дамы ў прыгарадных ад абласнога цэнтра вёсках каштуюць сёння ад 15 тысяч долараў і нават больш.

Супрацоўніца агенцтва Алена расказвае, што яшчэ 2—3 гады таму першыя такія дамы ў рэгіёне набывалі былыя ваенныя з Мурманска, каб на пенсіі жыць побач са сваімі сваякамі. Потым на Віцебшчыну «пацягнуліся» бліжэй да сваіх родных і іншыя расійскія вайскоўцы. Беларусь расіянам спадабалася. Цяпер вясковымі дамкамі гэтага беларускага азёрнага края цікавяцца не толькі жыхары Расіі з беларускімі каранямі, але і проста былыя вайскоўцы з Мурманска і іншых гарадоў-ваенных з расійскай глыбінкі.

Самае дарагое жыллё сёлета ў Віцебску купіла мясцовая шматдзетная сям'я. За 110 тысяч долараў быў набыты аднапавярховы сучасны дом агульнай плошчай каля 90 квадратных метраў і саўнай на цокальным паверсе. Летась самы дарагі катэдж набыла сям'я беларускіх бізнэсменаў за 130 тысяч долараў. Спачатку вялікі двухузроўневы катэдж з частковым аздабленнем прапаноўваўся пакупнікам за 150 тысяч, але сусветны крызіс прымусіў уладальнікаў жыллёвай нерухомасці згадзіцца з даволі вялікімі зніжкамі.

Сярод самага таннага жылля ў агенцтве сёння прадаецца добры драўляны дом у вёсцы за 35 кіламетраў ад Віцебска. Жылы дом 1994 года пабудовы мае адно вялікае жылое памяшканне плошчай 28 кв. метраў, невялікі пакойчык на другім паверсе і вялікі гараж. Такі дом прадаецца ўсяго за 7 тысяч долараў.

Самая дарагая кватэра сёлета ў Віцебску была прададзена за 75 тысяч долараў. Такую чатырохпакаёвую кватэру з якасным еўрарамонтам набыла вялікая мясцовая сям'я.

### Падаражэнне стандартных кватэр не прадбачыцца

Спецыялісты агенцтваў нерухомасці абласных цэнтраў заходняга і ўсходняга рэгіёнаў не прагназуюць у хуткім часе нейкага падаражэння стандартных кватэр на другасным рынку. У банках цяпер захоўваюцца даволі высокія працэнтныя стаўкі па крэдытах, што даюцца пад набыццё жылля. Спецыялісты мяркуюць, што, калі б гэтыя стаўкі знізіліся мінімум на 2—3 працэнты (да 13—15 працэнтаў), тады попыт на жыллё павялічыцца. А потым, відавочна, паўплывае на кошт продажу на рынку.

# «ПРЫБАЎКА» ДА ПЕНСІІ Ў ЗВЯЗЦЫ СА СТАТУСАМ

*(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)*

«Даплата» ў 100 працэнтаў мінімальнай пенсіі па ўзросце прадугледжана блакаднікам Ленінграда і вязням фашысцкіх месцаў прымусовага ўтрымання, якія не здзейснілі злачынстваў супраць Радзімы, а павышэнне ў 50 працэнтаў мінімальнай пенсіі па ўзросце можа выплачвацца інвалідам з дзяцінства ў выніку ранення, кантузіі ці знявечання, звязаных з баявымі дзеяннямі падчас Вялікай Айчыннай вайны, і асобам, што былі ўзнагароджаны ордэнамі і медалямі за самаахвярную працу і бездакорную вайсковую службу падчас вайны ў тыле.

— Часта павышэннямі цікавяцца менавіта прадстаўнікі апошняй катэгорыі, таму трэба адзначыць — узнагароджанне ордэнамі і медалямі за самаахвярную працу і бездакорную вайсковую службу падчас вайны ў тыле павінна пацвярджацца пасведчаннем вызначанага ўзору, — падкрэслівае Вольга Шынгірэй. — Разам з тым, калі такога пасведчання няма, то могуць прымацца да ўвагі пасведчанні да медалёў ці іншыя дакументы, што пацвярджаюць узнагароджванне — скажам, даведкі архіваў або запісы ў працоўных кніжках, якія зробленыя ў вызначаным парадку.

Разам з тым, ёсць шэраг павышэнняў, прызначэнне якіх не залежыць ад іншых даплат. У любым выпадку адбудзецца налічэнне павышэнняў Героям Беларусі, Савецкага Саюза і Сацыялістычнай Працы, а таксама асобам, што ўзнагароджаны ордэнамі Славы трох ступеняў і ордэнамі Працоўнай Славы зноў-такі трох ступеняў (для іх памер «даплаты» складае 500 працэнтаў мінімальнай пенсіі па ўзросце), бацькам і жонкам, што не ўзялі новы шлюб, вайскоўцаў, супрацоўнікаў унутраных спраў, органаў і падраздзяленняў па надзвычайных здарэннях, органаў фінансавых расследаванняў, смерць якіх звязана з выкананнем службовых абавязкаў (180 працэнтаў), дзецям-інвалідам з дзяцінства вайскоўцаў, супрацоўнікаў унутраных спраў, МНС і органаў фінансавых расследаванняў, смерць якіх звязана з выкананнем службовых абавязкаў, а таксама бацькам, жонкам, што не ўзялі новы шлюб, і дзецям-інвалідам з дзяцінства памерлых інвалідаў вайны (100 працэнтаў), грамадзянам, што былі неабгрунтавана рэпрэсаваныя ў 20—80 гадах мінулага стагоддзя і затым рэабілітаваныя, інвалідам з дзяцінства, якія атрымліваюць пенсію па ўзросце і якім інваліднасць устаноўлена пажыццёва (50 працэнтаў), а таксама донарам, якія дасягнулі агульнаўсталяванага ўзросту і пры гэтым маюць знакі «Ганаровы донар Рэспублікі Беларусь», «Ганаровы донар СССР» і «Ганаровы донар Таварыства Чырвонага Крыжа БССР» (40 працэнтаў). Аднак, зазначае Вольга Шынгірэй, варта звярнуць увагу: тыя ж ганаровыя донары павінны таксама паклапаціцца аб пацвярджэнні свайго статусу дакументальна.

Нарэшце, некалькі слоў аб «чарнобыльцах». Грамадзянам, якім непасрэдна ў сувязі з катастрофай на ЧАЭС вызначана I група інваліднасці, і дзецям-інвалідам з прычыны аварыі ва ўзросце да 18 гадоў павінны прызначацца надбаўкі ў памеры 100 працэнтаў, інвалідам-«чарнобыльцам» II групы — у памеры 75 працэнтаў, а інвалідам-«чарнобыльцам» III групы — у памеры 50 працэнтаў мінімальнай пенсіі па ўзросце.

Таксама ў памеры 50 працэнтаў мінімальнай пенсіі па ўзросце прадугледжваецца павышэнне пенсіі для асобаў, якія бралі ўдзел у ліквідацыі наступстваў чарнобыльскай катастрофы ў 1986—1987 гадах у зоне эвакуацыі (адчужэння) або якія былі занятыя ў той жа час на эксплуатацыі ці іншых работах на гэтай станцыі — у тым ліку гаворка аб асобах, што знаходзіліся ў камандзіроўках або на спецыяльных зборах.

Апроч таго, права на павышэнне пенсіі ў такім жа памеры маюць удзельнікі ліквідацыі некаторых іншых радыяцыйных аварый — грамадзяне, якія непасрэдна ўдзельнічалі ў выпрабаваннях ядзернай зброі ў атмасферы ці пад вадой, у выпрабаваннях баявых радыеактыўных рэчываў, у вучэннях з выкарыстаннем такой зброі або рэчываў да даты фактычнага спынення падобных выпрабаванняў і вучэнняў; грамадзяне, якія бралі непасрэдны ўдзел у падземных выпрабаваннях ядзернай зброі або ў правядзенні падземных ядзерных выбухаў у навукова-тэхнічных мэтах ва ўмовах пазаштатных сітуацый; грамадзяне, якія прымалі непасрэдны ўдзел у ліквідацыі радыяцыйных аварый на ядзерных энергетычных установках надводных і падводных караблёў ці іншых ваенных аб'ектах, а таксама на вытворчым аб'яднанні «Маяк» з 29 верасня 1957 па 31 снежня 1958 года, у правядзенні ахоўных мерапрыемстваў уздоўж забруджанай ракі Цеча з 1 студзеня 1949 па 31 снежня 1956 года; спецыялісты з ліку асобных падраздзяленняў па зборцы-разборцы ядзерных зарадаў, якія выконвалі гэту работу да 31 снежня 1961 года.

— Павышэнне для асобаў, якія бралі ўдзел у ліквідацыі наступстваў чарнобыльскай катастрофы ў зоне эвакуацыі (адчужэння) або якія былі занятыя на эксплуатацыі ці іншых работах на гэтай станцыі ў 1988—1989 гадах складае 25 працэнтаў мінімальнай пенсіі па ўзросце, — кажа Вольга Шынгірэй. — І на такое ж павышэнне пенсіі могуць разлічваць грамадзяне, што былі эвакуяваныя, адселеныя ці самастойна з'ехалі з зоны эвакуацыі (адчужэння), зонаў першачарговага і наступнага адсялення — за выключэннем тых, хто прыбыў у гэтыя зоны пасля 1 студзеня 1990 года.

Умова «даплат» у гэтых выпадках — таксама дакументальнае пацвярджэнне. Прычым варта заўважыць: тут зноў-такі давядзецца выбіраць толькі адну з магчымых прыбавак.

Нялішне таксама нагадаць, што ўсе надбаўкі і павышэнні заўсёды выплачваюцца адначасова з пенсіяй «асноўнай». І каб пераканацца, робіцца іх налічэнне або не, можна звярнуцца ў раённае ўпраўленне па працы, занятасці і сацыяльнай абароне.

# Радзіма малая, Радзіма вялікая...



Як былінны асілак Ілля Мурамец папаўняў сваю сілу ад сваёй роднай зямлі, так і Навагрудская зямля з'яўляецца крыніцай творчага натхнення для **доктара гістарычных навук, прафесара Міхаіла Паўлавіча КАСЦЮКА**, які сёлета адзначае 70-годдзе. І па сёння ён падтрымлівае цесныя сувязі са сваёй малой радзімай — родңай Навагрудчынай. Нарадзіўся ён у вёсцы Масцішча Навагрудскага раёна Гродзенскай вобласці 26 сакавіка 70 гадоў таму. Бацькі Міхаіла Паўлавіча — Павел Іосіфавіч і Марыя Дзмітрыеўна — шчыравалі на ўласнай зямлі, якой мелі амаль чатыры гектары.

Амаль 44 гады адлічвае стужка навуковага часу Міхаіла Касцюка. Яго значны ўклад у развіццё беларускай гістарычнай навукі атрымаў прызнанне навуковай грамадскасці нашай дзяржавы і замежжа. У 1989 г. ён быў абраны членам-карэспандэнтам Нацыянальнай акадэміі навук Беларусі, а ў 1996 г. — акадэмікам. У 1998 г. Міхаіл Паўлавіч атрымлівае дыпломы сапраўднага акадэміка Міжнароднай Акадэміі навук Еўразіі і Цэнтральнай Еўрапейскай Акадэміі навук і мастацтва, а ў 2003 годзе — прэмію Сібірскага аддзялення Расійскай акадэміі навук імя акадэміка В.А. Капцюга за даследаванне гісторыі беларускай дыяспары ў Сібіры. Паводле рашэння Міжнароднага навуковага савета Амерыканскага біяграфічнага інстытута, ён 5 разоў прызнаваўся Чалавекам года. Яго пяру належыць звыш 250 навуковых прац, якія прысвечаны вывучэнню актуальных праблемаў айчыннай гісторыі. Вялікі інтарэс навуковай грамадскасці як у Беларусі, так і Расіі, выклікала манаграфія акадэміка М. Касцюка «Бальшавіцкая сістэма ўлады на Беларусі» (Мн., 2000), перавыдадзеная ў 2002 годзе Інстытутам расійскай гісторыі РАН.

Не пакідае па-за ўвагай і сваю Навагрудчыну. Міхаіл Паўлавіч з вялікім імпэтам і задавальненнем займаўся падрыхтоўкай кнігі «Память. Гісторыка-дакументальная хроніка Навагрудскага раёна», што пабачыла свет у 1996 годзе. А ў ліпені 2009 года ён удзельнічаў у Міжнароднай навуковай канферэнцыі «Роля і месца Навагрудка ў гісторыі і культуры Еўропы».

Ёсць падставы весці гутарку пра фарміраванне навуковай школы акадэміка Касцюка. Пад яго навуковым кіраўніцтвам былі падрыхтаваны 2 дактары і 19 кандыдатаў навук. Глыбока перакананы ў тым, што «без гістарычных ведаў і выкарыстання гістарычнага вопыту нельга паспяхова будаваць незалежную дзяржаву», Міхаіл Паўлавіч надае вялікую ўвагу папулярызацыі гістарычных ведаў, выступаючы з цікавымі і змястоўнымі артыкуламі на старонках перыядычных выданняў, на радыё і тэлебачанні. Так, ён браў удзел у падрыхтоўцы дакументальных тэлевізійных фільмаў «Зваротны адлік», знятых на АНТ і прысвечаных розным этапам гісторыі Беларускай ССР, а таксама дакументальнага тэлевізійнага фільма, прысвечанага 90-годдзю Беларускай ССР, што быў падрыхтаваны і дэманстраваўся на тэлеканале СТБ. Даўнія і шчырыя сяброўскія сувязі звязваюць шаноўнага М. Касцюка з найстарэйшай беларускай газетай «Звязда», на старонках якой ён надрукаваў нямала надзённых, цікавых артыкулаў на гістарычную тэматыку.

**Валянцін МАЗЕЦ,**
**кандыдат гістарычных навук, старшы навуковы супрацоўнік Інстытута гісторыі НАН Беларусі.**

***«Звязда» таксама віншуе свайго даўняга аўтара з юбілеем.***

## ГЕРОЯ ЎШАНАВАЛІ ПА ЗАСЛУГАХ

**Наша газета паведамляла, што ў студзені выпадковы сведка пажару ў адным з дамоў Маларыты бясстрашна ўвайшоў у палаючую кватэру і вынес адтуль дваіх дзяцей.**

35-гадовы слесар вагоннага дэпо Пётр Аўдзяюк разам з жонкай ішоў па вуліцы а палове дзясятай вечара. Калі заўважылі дым, што паваліў з вокнаў, вырашылі не чакаць прыезду выратавальнікаў, а дзейнічаць самастойна. Бо ў такі час зімой вельмі верагодна, што ў кватэры знаходзяцца людзі. Спачатку Пётр хацеў выламаць уваходныя дзверы, але гэта зрабіць не ўдалося, тады ён выбіў шыбу і рашуча скочыў у пекла пажару. У дыме знайшоў па плачы дзяцей і ў лічаныя секунды перадаў іх у акно жонцы. Дзеці трох і аднаго гадоў засталіся жывыя і здаровыя дзякуючы мужнасці і адвазе Пятра і Валянціны Аўдзеюкоў. Дарослыя ў той дзень пакінулі малых без нагляду. Трохгадовы хлопчык знайшоў «цацку» — электракіпяцільнік — і уключыў яго ў разетку. На шчасце, побач праходзілі людзі...

І вось у калектыве вагоннага дэпо, дзе працуе Пётр, было наладжана яго ўрачыстае ўшанаванне. Начальнік Брэсцкага абласнога ўпраўлення МНС Канстанцін Шаршуновіч дзякаваў за выратаванне дваіх дзяцей ад імя абласнога выканаўчага камітэта і ўручыў грамату аблвыканкама. Былі таксама каштоўныя падарункі і цёплыя словы. Шкада, што за кадрам мерапрыемства засталася Валянціна Аўдзяюк. Што ж, сціплых жанчын лёс, бывае, узнагароджвае дастойнымі мужамі.

**Святлана ЯСКЕВІЧ.**

## СЕЗОН ПАЛЯВАННЯ НА ДЗІКІХ КАЧАК

**З першай суботы красавіка па другую нядзелю мая ў светлы час сутак, у адпаведнасці з Правіламі вядзення паляўнічай гаспадаркі і палявання, у краіне распачнецца чарговы сезон палявання на птушку.**

Зброевым спосабам з засады з падманьваннем, з падсаднымі качкамі ці чучаламі можна будзе здабываць самцоў крыжанкі, чырка-свістунка, чырка-траскунка, чырвонагаловай чэрнеці, чубатай чэрнеці. У гэты ж перыяд з 18 да 22 гадзін можна будзе паляваць зброевым спосабам на цязе на самцоў вальдшнэпа. Ва ўсіх пералічаных выпадках дазваляецца выкарыстоўваць гладкаствольную паляўнічую зброю з патронамі з дробам, а таксама для пошуку і падачы здабытай дзічыны — паляўнічых сабак (тэр'ераў, таксаў, выжлаў, апортараў, водных сабак).

**Сяргей РАСОЛЬКА.**

Прыгожае жыццё

# 76 ЧАЛАВЕК... НА АДНО ЗВАННЕ «МІСТАР СВЕТУ»

## У ліку прэтэндэнтаў і беларус

Увечары 27 сакавіка ў Сеуле (Паўднёвая Карэя) адбудзецца фінальнае шоу конкурсу прыгажосці «Mister World 2010», у якім упершыню бярэ ўдзел і Беларусь. Нават, можна сказаць, двайны ўдзел — мадэль Нацыянальнай школы прыгажосці і прафесійны спартсмен 21-гадовы Міхаіл Баранаў прадстаўляе нашу краіну, а 24-гадовы Хафіз Агаеў, хоць і выступае ад Азербайджана — таксама краіны-дэбютанта, але папярэднюю падрыхтоўку да конкурсу праходзіў у Мінску, у студыі моды Сяргея Нагорнага. Больш за тое, хлопцы прыляцелі на конкурс адным рэйсам і сярод вялікага мноства канкурэнтаў (сёлета за тытул самага прыгожага мужчыны свету спаборнічаюць маладыя людзі з 76 краін) па-сяброўску трымаюцца адзін аднаго.

Конкурс «Містар свету», які ладзіцца раз на два гады, пачынаючы з 2000 г. — не тыповы «агляд прыгажосці», да якіх мы прызвычаіліся, назіраючы жаночыя конкурсы. Дэфіле тут аддадзена далёка не галоўная роля. За 17 дзён удзельнікі праходзяць мноства іспытаў, збольшага — спаборніцтваў па розных відах спорту. Сёлета, напрыклад, маладых людзей чакала трэніроўка па праграме карэйскіх пехацінцаў, забег па горнай мясцовасці — на вышыні 1522 м над узроўнем мора — і па пляжы (прычым у апошнім хлопцам давялося не проста пераадольваць вільготны пясок, а бегчы з іншымі канкурсантамі на плячах), спаборніцтвы па пейнтболе, таэквандо, заезды на квадрацыклах, лёгкаатлетычная эстафета на стадыёне 4x100 метраў... У апошніх спаборніцтвах, між іншым, Міхаіл Баранаў у складзе каманды «сініх» — Беларусь, Аўстралія, Чэхія, Багамы — заняў першае месца. У большасці ж іншых спаборніцтваў у тройку лідараў практычна заўсёды траплялі чэх — былы прафесійны дзесяціборац. Па выніках усіх спаборніцтваў, прабегшы складаны 300-метровы «пляжны крос» за 1 хвіліну і 9 секундаў, менавіта канкурсант з Чэхіі і стаў «Містарам Спорт» і аўтаматычна трапіў у паўфінальную частку «Містара свету-2010». Але і нашага суайчынніка ёсць за што ўхваліць — абышоўшы амаль 60 супернікаў, беларус увайшоў у фінальную топ-8 конкурсу «Містар спорт» і да тройкі лепшых не дацягнуў зусім крыху.



**Інтэрнацыянальная пейнтбольная каманда. Прадстаўнікі (справа налева): Канады, Беларусі, Азербайджана, Аўстраліі, Бразіліі і Коста-Рыка.**

Усе без выключэння канкурсанты, «узброіўшыся» каскамі і пальчаткамі, удзельнічалі ў дабрачынным праекце міжнароднай арганізацыі «Habitat for Humanity» — расчышчалі ад будаўнічага смецця будучы прытулак для бяздомных у правінцыі Gyeonggi. І хоць тут старраннасць узнагароджвалася толькі маральна, ніхто з сяброў-супернікаў і не падумаў адвільваць ад цяжкай фізічнай працы.

Яшчэ адным выпрабаваннем для найпрыгажэйшых мужчын свету сталі кулінарныя спаборніцтвы — разбіўшыся на каманды, супернікі за пэўны час павінны былі згатаваць «бібімбап» — страву нацыянальнай кухні з цёплага рысу, на які слаямі выкладваюцца абсмажаная лустачкамі ў алеі гародніна, грыбы і вострая прыправа з перцам чылі. Змешваць усе кампаненты нельга — гэта робіцца непасрэдна перад ужываннем ежы. Кампетэнтнае журы ацэньвала вынік на выгляд, на смак, на пах, а таксама па арыгінальнасці сервіроўкі. Лепшым «кухарам па-карэйску» ў выніку быў названы прадстаўнік Калумбіі, які менавіта ў гэты дзень да таго ж святкаваў уласныя народзіны.



**Інгрэдыенты нацыянальнай карэйскай стравы «бібімбап».**

А вось у фінал творчага конкурсу «Містар Талент» трапілі прадстаўнікі ўсяго 20 краін — на жаль, у іх ліку не апынуліся ні Беларусь, ні Азербайджан. Затое ў тройку лідараў выйшаў прадстаўнік Расіі, прадэманстраваўшы танец самурая, які гледачы прызналі «зграбным і зачаравальным». Перамогу ж — і пуцёўку ў паўфінал — атрымаў удзельнік з Карэі, якому дапамаглі ці то родныя сцены, ці то ўласныя выбітныя вакальныя здольнасці.

У сераду адбылося моднае дэфіле, на якім удзельнікі дэманстравалі ўборы ад дызайнера Андрэ Кіма — сумесь футурыстычных мадэляў і нацыянальнага каларыту. Сярод тэмаў калекцыі, напрыклад, былі зімовыя Алімпійскія гульні-2018, на правядзенне якіх прэтэндуе ў тым ліку карэйскі П'ёнчанг; чэмпіянат свету ФІФА ў Паўднёвай Афрыцы; а таксама вясельная мода і сучасная інтэрпрэтацыя розных гістарычных перыядаў карэйскай гісторыі. «Калі ранейшыя модныя паказы на першым плане мелі жаночую прыгажосць, якой захапляліся мужчыны, то наша шоу дэманструе прыгожыя мужчынскія ўборы, якія могуць уразіць жанчын», — заўважыў дызайнер Андрэ Кім. Прыбытак ад паказу, які арганізатары зрабілі адкрытым для наведвальнікаў, будзе накіраваны на дабрачынныя мэты — у Міжнародны інстытут вакцыны, і на дапамогу паўночнакарэйскім дзецям з малазабяспечаных сем'яў. Для канкурсантаў жа галоўным вынікам паказу стала рашэнне журы на чале са старшынёй конкурсу «Містэр свету» Джуліяй Морлі — пераможцам конкурсу «Містэр Топ-мадэль» і яшчэ адным аўтаматычным паўфіналістам стаў прадстаўнік Бразіліі.



**Такой карэйскі дызайнер бачыць зімовую Алімпіяду-2018.**

Што ж, атрымліваецца, і Азербайджан, і Беларусь «у пралёце»? Альбо яшчэ ёсць шанц убачыць прадстаўнікоў гэтых краін у фінале самага прэстыжнага конкурсу мужчынскай прыгажосці? Як расказаў «Звяздзе» кіраўнік студыі моды Сяргей Нагорны, які падтрымлівае сувязь з абодвума «нашымі» канкурсантамі, у фінальным шоу ў любым выпадку на сцэне пакажуцца ўсе 76 маладых людзей, але толькі 15 з іх выйдуць на фінішную прамую — трое — за перамогу ў папярэдніх міні-конкурсах, астатнія — па рашэнні журы. «Сёння (у чацвер. — **Аўт**.) адбылося інтэрв'ю з журы, праўда, паколькі ў нас з Карэяй розніца па часе 7 гадзін, я даведаўся пра гэта толькі ноччу. Натуральна, і Хафіз, і Міша хваляваліся з-за моўнага бар'еру, аднак, паводле іх адчуванняў, інтэрв'ю прайшло ўдала, так што ў абодвух у прынцыпе ёсць шанцы прайсці ў фінальную частку конкурсу. Але прагназаваць я не бяруся — хоць заўжды перажываеш за сваіх, але на гэтым шоу ёсць даволі шмат моцных кандыдатаў», — адзначае Сяргей.

Неўзабаве інтрыга конкурсу раскрыецца — 27 сакавіка гледачы больш як 100 краін свету, дзе будзе транслявацца шоу, даведаюцца, хто стане «Містарам свету-2010», а таксама хто атрымае тытулы першага і другога «Віцэ-Містара» (у Беларусі паглядзець конкурс змогуць толькі ўладальнікі спадарожнікавага тэлебачання). Пераможцу дастанецца грашовы прыз у 50 тысяч долараў, а таксама кантракт з брытанскім мадэльным агенцтвам. Зрэшты, і ў іншых канкурсантаў, нават калі яны не трапяць у прызёры, ёсць шанц зацікавіць вядучыя замежныя мадэльныя агенцтвы і атрымаць цікавыя прапановы, альбо рэалізавацца ў іншай сферы — напрыклад, папярэдні «Містар свету», іспанскі самелье Хуан Гарсія, зрабіў паспяховую кар'еру на тэлебачанні.

**Вікторыя ЦЕЛЯШУК.**
**Фота з афіцыйнага сайта конкурсу www.mrworld.tv.**

## Пытанне наўздагон

**— Калі ўдача ўсміхнецца прадстаўніку Азербайджана, гэта будзе перамога выключна Азербайджана ці ўсё ж агульная?**

